


VERTIGO
DC COMICS
WARREN ELLIS • DARICK ROBERTSON • RODNEY RAMOS
NO. 15
NOV 98
LATE EDITION
TRANSMETROPOLITAN™
$2.50 US
$3.75 CAN
SUGGESTED FOR MATURE READERS
.BY
КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
ТРАНСМЕТРАПАЛІТЭН #15
ПЕРАКЛАД:
АРТУР БАРАДАЧОЎ
АФАРМЛЕННЕ:
СЯРГЕЙ КОЗЫРАЎ
COMICSBY.BY
VK.COM/COMICS_BY



Крыніца, набліжаная да сенатара, паведаміла, што ён апісаў самую вялікую групу выбарцаў як "Новыя паскуднікі" і паказаў на тое, што маральныя нормы сенатара падобны на нормы манструёзнага Джо Хелера…

Выглядае так, што з'езд хутка вызначыць таго хлопца, які будзе пярдоліць нас наступным…

Спайдар Ерусалім,
"Я ненавіджу тут знаходзіцца", "Слова".



Год вырадка


Частка 3: Усмешка

RODNEY RAMOS inker · NATHAN EYRING color & seps · CLEM ROBINS letters · CLIFF CHIANG ass't ed. · STUART MOORE editor

TRANSMETROPOLITAN created by WARREN ELLIS & DARICK ROBERTSON

TRANSMETROPOLITAN 15, November, 1998. Published monthly by DC Comics, 1700 Broadway, New York, NY 10019. POSTMASTER: Send address changes to TRANSMETROPOLITAN, DC Comics Subscriptions, P.O. Box 0528, Baldwin, NY 11510. Annual subscription rate $30.00. Canadian subscribers must add $12.00 for postage and GST. GST # is R125921072. All foreign countries must add $12.00 for postage. U.S. funds only. Subscriptions to this title are offered only to readers who attest they are 18 years of age or older, or with written parental approval to readers under 18 years of age.
Printed in Canada.
DC Comics
A Division of Warner Bros.—A Time Warner Entertainment Company





УСМЕШЛІВЫ ПАДАЕ Ў РАНІШНІМ РЭЙТЫНГУ БЕСПАРТЫЙНЫХ КАНДЫДАТАЎ



BEAST
face
new


МЫ НА ВУЛІЦЫ З ЕЛЕНАЙ РАСІНІ, ЗМРОЧНА ПРЫГОЖАЙ АСІСТЭНТКАЙ СПАЙДАРА ЕРУСАЛІМА. ШТО ВЫ НЕСЯЦЕ, ЕЛЕНА?
LIVE PT-OPC
Я КОНАР БАЙГЕНТ, РЭПАРЦЁР ДЛЯ ПТ-ЗА.
ШТО?
ПАЛІТЫЧНАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ – З'ЕЗД АПАЗІЦЫІ.
LIVE PT-OPC
ПРАМЫ ЭФІР?
НУ ХІБА ЯНА НЕ ЦУДОЎНАЯ? ЦІ ЛІЧЫЦЕ ВЫ ГЭТЫ З'ЕЗД НЕАБХОДНЫМ?
ДОБРА, Я ШТОСЬЦІ НЯСУ ДЛЯ ГЭТАГА СТАРОГА... ДЛЯ МІСТЭРА ЕРУСАЛІМА.
PT-OPC VIX POP: YELENA ROSSINI
МАБЫЦЬ, ГЭТА СКЛАДАНА. ГЭТА ВЯЛІКІ СТРЭС ДЛЯ ЯГО – АСВЯТЛЯЦЬ З'ЕЗД. ДАВАЙЦЕ ПАБАЧЫМ, ЯК СПАЙДАР ЕРУСАЛІМ СПРАЎЛЯЕЦЦА З ВЫМАТВАЛЬНАЙ ПРАЦАЙ, СЯБРЫ...
НАЦІСНІЦЕ, КАБ ДАВЕДАЦЦА АБ БІЯГРАФІІ ЕЛЕНЫ РАСІНІ.
ПАКЕТ СВЕЖЫХ ВАЧЭЙ ДЗІЦЯНЯТ ЦЮЛЕНЯЎ.
МАЗГІ ЧОРНАГА МАРСКОГА АКУНЯПАТЭ КАНТРАБАНДАЙ З ДЭЛІ.
НА СКРЫНЦЫ НАПІСАНА "КАНСЕРВАВАНЫЯ ДЗЕЦІ". АЛЕ Я НЯ ВЕДАЮ, ШТО ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ.
BABY SEAL EYES
І СОРАК ФОТАЗДЫМКАЎ ГОЛЫХ ГЕРТРУДЫ ШТЭЙН І АЛІСЫ Б. ТОКЛАС, ЯКІЯ КОРМЯЦЬ АДНА АДНУ СПАРЖАЙ.
ЁН КАЖА, ГЭТА ДАПАМАГАЕ СКАНЦЭНТРАВАЦЦА.






Заўважылі, якім ціхім стаў муніцыпалітэт на гэтым тыдні? Наш кірмашовы Горад, безумоўна, далучаны ў гонку на боку Звера. І вы ведаеце, што гэта за гонка? Школы не працуюць. Дзеці на апецы не абаронены ад працаўнікоў-педафілаў. Мільёны растрачаны на бязмэтавыя ўнутранныя расследаванні. Бяздомныя сем'і заселены ў панэльныя азбеставыя дамы, падчас аперацыі, калі непарушныя правы чалавека былі зняважаны ў імя "палітычнай матывацыі". І, зразумела, пакуль яны захраснулі ў сур'ёзных перадвыбарных махінацыях, існуе ўнутраны распарадак "прытрымлівання законаў у мэтах правільнай падтрымкі выбаршчыкаў".




callahan
...ДОБРА... ДАЙ МНЕ ЎСЁ РАСТЛУМАЧЫЦЬ, АНДЭК.
КРЫНІЦА СПАЙДАРА ЕРУСАЛІМА – НЕ ПРАБЛЕМА. УВОГУЛЕ, **АРТЫКУЛ** СПАЙДАРА – НЕ ПРАБЛЕМА.
ПРАБЛЕМА Ў ТЫМ, ШТО Я АДЧУВАЮ ГОРКАЕ РАСЧАРАВАННЕ Ў ПРЭСЕ, ЯКАЯ НАКІНУЛАСЯ НА ГЭТА ПЫТАННЕ.
У ГОРАДЗЕ КОЖНЫЯ ДЗЕСЯЦЬ ХВІЛІН АДБЫВАЮЦЦА ЗЛАЧЫНСТВЫ, ЯКІЯ СУЧАСНЫ МЭР... ДА БОЛЮ ЛАЯЛЬНЫ ДА ПРЭЗІДЭНТА... КРЫЕ **АДМОВАМІ**.
АДМІНІСТРАЦЫЯ ЎВЯЗНУЛА Ў ГРАХАХ. ВАШ АБАВЯЗАК ДАНЕСЦІ ГЭТА ЖЫХАРАМ ГОРАДА. ЛЮДЗІ, **ВОСЬ ГЭТА НАВІНЫ**.
ЗАМЕСТ ГЭТАГА **ВЫ** ЎЗЯЛІ ГЭТЫ АНЕКДОТ І ЗРАБІЛІ З ЯГО НАВІНУ МЕСЯЦА. **ГАНЬБА** НА ВАШЫ ГАЛОВЫ.
ТАКСАМА І Я, ЯК СЕНАТАР МАЮ АДКАЗНАСЦЬ ЗА ДАВЕР, ЯКІ МНЕ ЗРАБІЛІ – МЫ ЎСЕ ПАВІННЫ КЛАПАЦІЦЦА ПРА ТЫХ, ХТО НАМ ВЕРЫЦЬ.
НЕ ПУСКАЙЦЕ СПАЙДАРА ЕРУСАЛІМА Ў ЭФІР. НЕ ПУСКАЙЦЕ НІ ЯГО, НІ МЯНЕ. КАЛІ ПАЛІЧЫЦЕ, ШТО ТАК ТРЭБА.
АЛЕ, БОЖА, **ПАВЕДАМІЦЕ** ЛЮДЗЯМ **САПРАЎДНЫЯ** НАВІНЫ.
LIVE
МЯНЕ ЗАВУЦЬ ЕЛЕНА РАСІНІ. І Я АСІСТЭНТКА СПАЙДАРА ЕРУСАЛІМА.
МНЕ ДВАЦЦАЦЬ ЧАТЫРЫ ГАДЫ. Я НАРАДЗІЛАСЯ Ў ГОРАДЗЕ. Я З ПАВАЖАНАЙ МЯСЦОВАЙ СЯМ'І.
SPKF
YELENA ROSSINI LIVE
Я РАЗМАЎЛЯЮ НА СЯМІ МОВАХ. НЯДАЎНА СКОНЧЫЛА БІЗНЕС-ШКОЛУ ХІЛІСА Ў ПАЎНОЧНЫМ РАЁНЕ...
...І ТАК. Я ПРАЦУЮ НА СПАЙДАРА ЕРУСАЛІМА КАЛЯ ТЫДНЯ. ГЭТА САПРАЎДЫ ЦІКАВА.
LIVE
ГЛЯДЗЕЦЬ ЗА КУЛІСЫ ПАЛІТЫКІ ЗАЎСЁДЫ ВЕСЕЛА. МОЙ ТАТА ДАПАМАГАЎ ФІНАНСАВАЦЬ КАМПАНІЮ ЛОНГМАРША, АЛЕ Я БЫЛА ЗУСІМ МАЛЕНЬКАЙ, КАБ ЗВЯРНУЦЬ НА ГЭТА ЎВАГУ.
НЕ, МІСТЭР ЕРУСАЛІМ НЯ ВЕДАЕ ПРА ГЭТА. ЁН НІКОЛІ НЕ ПЫТАЎ.
LIVE
ЯК Я З ІМ УЖЫВАЮСЯ?
НУ, ЁН ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ ЗАПОМНІЎ МАЁ ІМЯ.
LIVE
АДНОЙЧЫ ЁН УСТАЎ ПАСЯРОД РАЗМОВЫ І ЗАПЫТАЎ МЯНЕ: "А ТЫ ХТО ТАКАЯ? І ШТО ТЫ РОБІШ У МАЁЙ КВАТЭРЫ?"
А ЎЧОРА ЁН ДЗВЕ ГАДЗІНЫ ДУМАЎ, ШТО ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ВАЛЬЕРЫ НЕДЗЕ Ў ПОЛЬШЧЫ.
АДНОЙЧЫ ЁН НАЗВАЎ МЯНЕ ШЭНАН.



СЛУПОК: НАТАТКІ З ГОНКІ.
HE WORKS AS HARD AS YOU DO...
MAKE YOUR VOTE COUNT
Bob Heller
HELLER
СЕНАТАР БОБ ХЕЛЕР ТРЫМАЕ ЎСМЕШЛІВАГА ЗА ЯЙКІ. І Я МАГУ НА ЧАС ЗАБЫЦЦА ПРА ЯГО. НАДЫШОЎ ЧАС ГЛЯНУЦЬ НА ХЕЛЕРА.
ГЭТАЙ НОЧЧУ ГОНКА ХЕЛЕРА ПАЧНЕЦЦА ПРАЗ ПЯТНАЦЦАЦЬ ХВІЛІН ПАСЛЯ ЗАКРЫЦЦЯ ПІЎНУХ; І ЯГО ВЫСТУПЛЕННЕ БУДЗЕ Ў ПЯТНАЦЦАЦІ ХВІЛІНАХ ПЕШКІ АДСЮЛЬ.
БОБ ХЕЛЕР РУПЛІВА ВЫБІРАЕ МЕСЦА ДЛЯ СУСТРЭЧЫ. І МЫ ЎСЕ, ПЕРАБЛЫТАЎШЫСЯ, УВАХОДЗІМ ПРАЗ ЗАЛАТЫЯ ВАРОТЫ ДА МАНАРХА.



HELLER
ГЭТА ХАЛЕРА СМЯРДЗІЦЬ ЯК ЧОРТАВАЕ ЛАЙНО, ХЛОПЕЦ. НЕНАТУРАЛЬНА. ВЫКІНЬ.
ШТО ТЫ СКАЗАЎ?
Я СКАЗАЎ ТАБЕ **ВЫКІНУЦЬ** ГЭТА, ПРЫТЫРАК.
ЙААА.
ГЭТА ШЛЯХ СІЛЫ. МУЖЫК.
ХА-ХА.
ІДЫЁТ АТРЫМАЎ СВАЁ.
САПРАЎДНЫ АМЕРЫКАНЕЦ.
ДОБРАЯ ПРАЦА, МУЖЫК.


ЗНЯНАЦКУ НАСТУПІЛА ЦІШЫНЯ; ЯНЫ ЗАТРЫМЛІВАЛІ СВАЁ ДЫХАННЕ, ЯК ПЕРАД АРГАЗМАМ. НА СЦЭНЕ, ПАКАЗВАЮЧЫ ПРЫВІТАЛЬНУЮ РАДАСЦЬ ДА МАЛЕНЬКАЙ ФІГУРЦЫ, ЗАСТЫЛІ ЎСМЕШКІ.
А ВОСЬ І ЁН. НАСТОЛЬКІ СЭКСУАЛЬНЫ, ШТО НАВАТ РЭКЛАМНЫЯ ДЗЯЎЧЫНКІ Ў ДВА РАЗЫ ВЫШЭЙ ЗА ЯГО СПРАБУЮЦЬ ЯГО НА СМАК.
ВАКОЛ МЯНЕ ДЫХАННЕ ВА ЎСІХ ЗАЦІХЛА Ў ГРУДЗІ...
...І ВЫБЫХНУЛА РАПТОЎНЫМ РОВАМ УХВАЛЕННЯ І КАХАННЯ. А ЁН МОЦНА ЗАПАЎ ІМ У ДУШУ... БОЖА...
У БОБА ХЕЛЕРА ПА-САПРАЎДНАМУ СУРОВЫ ТВАР.


У АПОШНІ ЧАС ШМАТ ЛЮДЗЕЙ КАЖУЦЬ МНЕ ПРА ЎСМЕШЛІВАГА.
heller
АГА. Я ЧУЮ ВАШ СМЕХ... ВЫ ТАКСАМА ГЭТА ЧУЛІ, ТАК?
МНЕ ЁСЦЬ, ШТО СКАЗАЦЬ ПРА ЎСМЕШЛІВАГА.
ЁН – СЛАБАК.



БОЖА, ГЭТЫ **ГУК**... МАСА НЕНАВІСНЫХ, НІЗКІХ ГАЛАСОЎ, ЯКІЯ ЗМЕШВАЮЦЦА Ў ДЗІКІ РОЎ...
ЁН ВЕРЫЦЬ У ТЭОРЫЮ ДЛЯ СЛАБАКОЎ.
МОЖА ЁН ЯШЧЭ І **ПАЦЫФІСТ**? АГА? ВЕДАЮ, ШТО ГЭТА СМЕШНА...
heller
ВЫ ВЕДАЕЦЕ ГЭТА. ВЫ **АМЕРЫКАНЦЫ**.
ВЫ ВЕДАЕЦЕ, ШТО ПРЫРОДА НЕ ПАЦЕРПІЦЬ АБ'ЯДНАННЯ СІЛЫ З КВОЛАСЦЮ.
heller
ПРЫРОДА ТАКОЕ НЕ ПРЫМАЕ. І АМЕРЫКАНЦЫ НЯ ПРЫМУЦЬ НІЧОГА НЕНАТУРАЛЬНАГА. ТОЛЬКІ НЕ САПРАЎДНЫЯ АМЕРЫКАНЦЫ.
І АМЕРЫКА ДЛЯ АМЕРЫКАНЦАЎ!
І ВЕДАЕЦЕ ШТО?
ЯШЧЭ БОЛЬШ, ЧЫМ ПРЫРОДА НЯ ЦЕРПІЦЬ ЗМЕШВАННЯ КВОЛЫХ І СЛАБЫХ ЛЮДЗЕЙ, ЯНА НЯ ЦЕРПІЦЬ ЗМЕШВАННЯ ВЫСШЭЙШЫХ І НІЖЭЙШЫХ РАС.
І ЦЯПЕР УСЯ ЯГО ПРАЦА ПА СТВАРЭННІ ВЫШЭЙШАЙ РАСЫ, ЯКАЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА СОТНІ І ТЫСЯЧЫ ГАДОЎ, МОЖА БЫЦЬ РАЗБУРАНА АДНЫМ УДАРАМ.
АДНЫМ УДАРАМ.
ГІСТОРЫЯ МАЕ НЕЗЛІЧОНЫЯ ДОКАЗЫ ГЭТАГА.


ЁН ПАКАЗВАЕ З
ЖУДАСНАЙ
ВЫРАЗНАСЦЮ, ШТО КОЖНАЕ ЗМЯШЭННЕ АМЕРЫКАНСКАЙ КРЫВІ З КРЫВЁЮ НІЖЭЙШЫХ ЛЮДЗЕЙ ПРЫВОДЗІЦЬ ДА ВЫРАДЖЭННЯ.
КАЛІ ЧАЛАВЕК СПРАБУЕ ПАЎСТАЦЬ СУПРАЦЬ ЖАЛЕЗНАЙ ЛОГІКІ ПРЫРОДЫ, ЁН БУДЗЕ РАСЦІНУТЫ ПРЫНЦЫПАМІ, ДЗЯКУЮЧЫ ЯКІМ УВОГУЛЕ МАГЧЫМА ІСНАВАННЕ ЧАЛАВЕКА.
І ГЭТЫ МЯЦЕЖ ЗАЎСЁДЫ ВЯДЗЕ ЯГО ДА ЎЛАСНАЙ СМЕРЦІ.
ТУТ, БЕЗУМОЎНА, МЫ СУТЫКАЕМСЯ З ПЯРЭЧАННЯМІ СУЧАСНЫХ ПАЦЫФІСТАЎ...
ЯНЫ КАЖУЦЬ: "Я ЖАДАЮ КІСКІ АМЕРЫКАНАК. А Ў ВЫПАДКУ ЧАГО-НЕБУДЗЬ Я **СХАВАЮСЯ** ПАД СПАДНІЦУ!"
Country
Bob Heller
VOTE FOR A
NO WEIRDOS
Take a STAND, with BOB HELLER
Bob is TIRED OF
Я КЛЯНУСЯ, ШТО НЕ СКАЖУ НІ СЛОВА Ў ЯГО ПАДТРЫМКУ.





ГАЛОЎНЫ ПАРАГРАФ:
ДВА ДНІ Ў ГЭТЫМ КРУГАВАРОЦЕ ЗРАБІЛІ МЯНЕ РАЗБІТЫМ І ПАКІНУТЫМ. НАВАТ РЭЧЫВА, ЯКОЕ Я ПРЫМАЎ, КАБ ЗАХАВАЦЬ СВЕТЛЫ РОЗУМ, ПЕРАСТАЛІ ПАДТРЫМЛІВАЦЬ У МЯНЕ ЦІКАВАСЦЬ ДА СВЕТУ. Я ГУЛЯЎ У ГУЛЬНЮ ЯК САМАДАЙКА-РАЗУМНІЦА, ЗАБЛЫТАНЫ І ПРАКЛЯТЫ СЛОВАМІ, ВЫКОНВАЮЧЫ ПРАЦУ ПА НАПІСАННІ СЛУПКА.
ХУТКА Я ПАЙДУ СПАЦЬ І СПАДЗЯЮСЯ, ШТО ПЕКЛА ГЭТАГА СВЕТУ НЯ ХУТКА РАЗБУДЗІЦЬ МЯНЕ. Я ТАКСАМА СПАДЗЯЮСЯ, ШТО ДА МАЙГО АБУДЖЭННЯ ПАЛОВА ГОРАДА ЗДЗЕЙСНІЦЬ САМАГУБСТВА Ў МОЙ ГОНАР...
ELLIS HARD WHISKY
CARCINOMA ANGEL
MAY 25
DEAR MR. JERUSALEM,


PTOO
ХЕ-ХЕ.
ГАВОРАЦЬ ВАШЫ ДЗВЕРЫ. ДА ВАС ПРЫЙШОЎ НОВЫ НАВЕДВАЛЬНІК.


ДОКТАР ВІТА СЕВЕРН. МЫ ЎЖО СУСТРАКАЛІСЯ: Я ПАЛІТЫЧНЫ ДЫРЭКТАР СЕНАТАРА КАЛАХАНА... Я ТУТ, КАБ СУСТРЭЦЦА СА СПАЙДАРАМ ЕРУСАЛІМАМ.
ЯК БЫ ТАМ НІ БЫЛО, УВАХОДЗЬЦЕ.
ЗДАЕЦЦА, ЁН СПІЦЬ, МІС РАСІНІ...
ДЫ НЕ ХВАЛЮЙЦЕСЯ, ЁН ПРЫКІДАЕЦЦА.
ВЫ Ж ПРОСТА ПРЫКІДАЕЦЕСЯ, ТАК ЖА?
СВІСТАЦЬ УСІХ НАВЕРХ! ГАТОВЫ ДА СЛУЖБЫ! ТРЫВОГА! ВАРТАВЫ!
Я ЎПАЎ.


ВІТА СЕВЕРН, Я ТРОХІ СТАМІЎСЯ ДЛЯ МІНЕТА. З УСЁЙ ПАВАГАЙ, АЛЕ...
Я ТУТ НЕ ДЗЕЛЯ ІНТЭРВ'Ю. СЕНАТАР НЯ ВЕДАЕ, ШТО Я ТУТ.
ЯК МНЕ ШАНЦУЕ. А Я ШЧАСЛІВЫ ПЕЧАНЫ ГАД. СЛУХАЮ.
Я ТУТ, КАБ ПАГАВАРЫЦЬ ПРА КАМПАНІЮ.
МЫ ВЫЯВІЛІ, ШТО ВЫ ВЫКАРЫСТОЎВАЛІ ГАЗ-КРЫНІЦУ НА НАШАЙ НАРАДЗЕ.
ДАСТАТКОВА.
МАЛЕНЬКІЯ ВЕДЫ - ГЭТА НЕБЯСПЕЧНАЯ РЭЧ. ТАК ЖА КАЖУЦЬ? І ТАГО, ШТО ВЫ ВЕДАЕЦЕ, УЖО ДАСТАТКОВА ДЛЯ АПАСАК.
АПОШНІЯ АПЫТАННІ КАЖУЦЬ, ШТО ВЫ, МАГЧЫМА, ЗНІШЧЫЛІ СЕНАТАРА. КАЛІ Б У НАС БЫЛО НЕКАЛЬКІ ТЫДНЯЎ, МЫ Б МАГЛІ ВЫПРАВІЦЦА. АЛЕ Ў НАС ТОЛЬКІ ДНІ.
РАСТЛУМАЧЦЕ, ЧАМУ Я ПАВІНЕН УДЗЯЛЯЦЬ ГЭТАМУ БОЛЕЙ ПАВАГІ, ЧЫМ ЧЭЛЕСУ ЗДОХЛАГА САБАКІ?
ТАМУ ШТО Ў ЯГО ЁСЦЬ ПРАЦА, ТРАСЦА ВАМ У БОК. ЁН ЗРУШЫЦЬ СУЧАСНАГА ПРЭЗІДЭНТА. І ЛЕПЕЙ, КАБ ГЭТА БЫЎ ЁН - КРАІНА НЯ ВЫТРЫМАЕ БОБА ХЕЛЕРА ЦІ АДНАГО З ТЫХ БЕЗЫМЕННЫХ, ЯКІЯ НАРОБЯЦЬ ЧОРТ ВЕДАЕ ШТО, БУДУЧЫ НА ПАСАДЗЕ...
ЯК ПАЖАДАЕЦЕ. МЫ НОВЫЯ ПАСКУДНІКІ, МЫ ВЕДАЕМ СВАЁ МЕСЦА, МІС ВІТА.


КАЛІ Б ВЫ ПАДТРЫМАЛІ ЯГО...
Я НЕ МАГУ СХІЛІЦЬ АЎДЫТОРЫЮ ДА КАГО-НЕБУДЗЬ...
БОЖА, ВЫ ЖУРНАЛІСТ, А НЕ МАНАХ. НЯЎЖО ТАК СКЛАДАНА?
ЦІ ВЫ САПРАЎДЫ ГОЛАС НАРОДА? ЯНЫ ЎСЕ ЗРОБЯЦЬ, ЯК ВЫ СКАЖАЦЕ?
О, СЕМІНАРСКІЯ КУРСЫ ПСІХАЛОГІІ. ДЫ ВЫ ГРАЕЦЕ НА МАІМ ЭГА, ЯК НА ПІЯНІНА - ЗАРАЗ Я ПЕРАТВАРУСЯ Ў ХАТНЮЮ ЯШЧАРКУ ПРЭЗІДЭНТА...
ЛАЙНАГАЛОВЫ МАРКІТАВАНЫ НАРКАМАН... НЯ ВЕДАЮ, ЧАМУ Я ВЫРАШЫЛА, ШТО ГЭТА ДОБРАЯ ІДЭЯ...
ВЫ ЗМЯНІЛІ ПРЫЧОСКУ.
ШТО?
ВЫ ЗМЯНІЛІ ПРЫЧОСКУ. СКАЖЫЦЕ, ЧАМУ?
ТАЯ ПРЫЧОСКА - ГЭТА МАНІПУЛІРАВАННЕ, СЕМІЯТЫЧНЫ ТЭРАРЫЗМ. ІДЭЯ ШАЦА.
ДЗЯКУЮЧЫ ЁЙ Я ВЫГЛЯДАЮ РАЗУМНАЙ І МЭТАНАКІРАВАНАЙ, АЛЕ ТАКСАМА І ТОЙ, ХТО ЗМАГАЕЦЦА З ІМПЕРЫЯЙ ЗЛА...
ЖУДАСНЫЯ БРЫДКІЯ РЭЧЫ.


ВЫ П'ЯЦЕ КАВУ?
"КАМПАНІЯ АДЛЮСТРОЎВАЕ КАНДЫДАТА". ЖАРТ ПАЛІТПРАЦАЎНІКОЎ. СТАРЫ, ЯК МАЯ БАБКА.
ГЭТА КАМПАНІЯ НЕ АДРОЗНІВАЕЦЦА, АЛЕ... ЯНА РАЗДРОБЛЕНАЯ. Я Б НЕ ЖАДАЛА ЗДАЦЦА ШЫЗАФРЭНІЧКАЙ, АЛЕ...
АЛЕ МЫ ЎСЕ ЎЦЯГНУТЫ Ў ГЭТУ КАМПАНІЮ. МЫ ЎСЕ ЎДЗЯЛЯЕМ ЁЙ УВАГУ. У ЁЙ ЁСЦЬ НЕШТА, ШТО РОБІЦЬ НАС ЛЕПЕЙ. ЯК І КАНДЫДАТА.
ВЕДАЕЦЕ, Я ЧАГОСЬЦІ НЕ РАЗУМЕЮ. ЧЫМ ВАМ ПАДАБАЕЦЦА КАХАЛАН?
ЁН УСЮ СВАЮ АСОБУ ПАБУДАВАЎ НА КАВАЛАЧКАХ ІНШЫХ ЛЮДЗЕЙ. ПАЛОВУ ЧАСУ ЁН ВЫГЛЯДАЕ ЯК АЎТЫСТ, А ІНШУЮ ЁН ПАДОБНЫ НА ЯШЧАРА, НАБІТАГА ЛІТЫЕМ І РТУЦЦЮ. ГЭТЫЯ ЧЭРЦІ НЕ ВЫКЛІКАЮЦЬ КАХАННЯ Ў БОЛЬШАСЦІ.
ШТО ВЫ Ў ІМ БАЧЫЦЕ, ДЫК ГЭТА РАСКОЛ. ГЭТА ДЗЯКУЮЧЫ ШАЦУ, НА САМОЙ СПРАВЕ. ШАЦ РАЗГЛАГОЛЬСТВУЕ ПРА "ТРЭЦІ ШЛЯХ". І ВЫ ЧУЛІ, ШТО СЕНАТАР ПАЎТАРАЎ ГЭТА...
АПОШНЯЯ ПРАМОВА: "ТРЭЦІ ШЛЯХ, ЯКІ ЎВАБРАЎ У СЯБЕ ЛЕПШАЕ АД КАНСЕРВАТЫЗМУ І ЛІБЕРАЛІЗМУ..."
НЯЗНАЧНА АДРОЗНІВАЕЦЦА АД ЛОНГМАРШАШСКАЙ "ПАЛІТЫКІ РАДАСЦІ, ЯКАЯ ЗНАХОДЗЕ ДОБРАЕ ВА ЎСІХ РЭЧАХ..."
А ТЫ МНЕ ПАДАБАЕШСЯ. ЯК ТАМ ТВАЁ ІМЯ?Ё
АЛЕ ТОЕ, ШТО **ШАЦ** МАЕ НА ЎВАЗЕ – ГЭТА ШЛЯХ ПАМІЖ ПАЎПРАЎДАЙ І ПОЎНАЙ ХЛУСНЁЙ. ГЭТА ВЕЛЬМІ ДВУДУШНЫ ЧАЛАВЕК.
СЕНАТОР ПРЫСЛУХОЎВАЕЦЦА ДА ШАЦА. НАЗЫВАЕ ЯГО "НОВЫМ ПАЛІТЫКАМ". ГЭТА МЯНЕ ХВАЛЮЕ.
АЛЕ КАЛІ СЕНАТАР КАЖА ГУЛЯЦЬ, МЫ ГУЛЯЕМ. ВЫ БАЧЫЛІ МАЕ ВАЛАСЫ. ВЫ БАЧЫЛІ ЯГО ЎСМЕШКУ. ЦЭЛАЯ МАРКІТАВАНАЯ КАМПАНІЯ ГУЛЬНЯЎ І МАСКІРОВАК.
ШАЦ НАЛАДЗІЎ ЦЭЛУЮ КАМЕДЫЮ ШЭКСПІРА... АЛЕ ЯНА **МАТЭРЫЯЛЬНА**. ГЭТА САМАЯ ВАЖНАЯ ГУЛЬНЯ Ў АМЕРЫЦЫ.
ДЫК ШТО З ЗАЎТРАШНІМ СЛУПКОМ? СЕНАТАР ПРЫМУСІЦЬ НАС ЯГО ПРАЧЫТАЦЬ...
ПАЧАКАЙЦЕ І ЎБАЧЫЦЕ, ДОКТАР...
ДАРУЧЫЦЕСЯ МНЕ.



Доктар Віта Северн бліскучая, забаўная, кіслотная, брутальная і палкая. Яна... адзіны чалавек, якога я сутрэў у палітыке. І тое, што яна палітычны дырэктар, прымушае мяне ўсміхацца.

Наколькі я магу бачыць, яе найманне Ўсмешлівым – гэта знак таго, што ён сапраўды разбіраецца ў людзях. І яна адзіная прычына галасаваць за яго.

Спайдар Ерусалім,
"Я ненавіджу тут знаходзіцца", "Слова".

